Год 1. Аўторак, 20 сьнежня (7 дзекабра) 1921 г. № 15

БЕЛАРУСКІЯ ВЕДАМАСЬЦІ

АДРЭС РЭДАКЦЫІ і КАНТОРЫ: Вільня, Вострабрамская 9 (Wilno, Ostrobramska 9), АДЧЫНЕНА што дня, апрача сьвят, ад 11 да 2 гадзіны.

Падпіска з паштовай перасылкай на 3 месяцы 400 польскіх марак. За граніцай у два разы даражэй.

Цана абвестак: 75 польскіх мар. за радок самага дробнага шрыфту. Газэта выходзіць раз у тыдзень.

№ каштуець 30 польскіх марак.

Часовая Урадавая Камісія Віленскага Саюзу Каапэратываў.

Склікае на 28 сьнежня (дзекабра) г. г. аб 11 гадзіне раніцы надзвычайнае вальнае сабраньне паўнамоцнікаў у будынку Польскага Работніцкага Дому (вул. Жэлігоўскага 4) з гэткім парадкам дня: 1) выбары прэзыдыуму зьезда, 2) выбары Мандатнай і інш. Камісій; 3) справаздача Рэвізыйнай Камісіі; 4) справаздача Рады; 5) справаздача бышага ўраду; 6) справаздача Часовай Урадавай Камісіі аб цяперашнім палажэньні Саюза; 7) плян будучай дзеяльнасьці і арганізацыя Саюзу; 8) выбары Ураду і іншых органаў Саюзу; 9) вольныя пытаньні.

Калі-б 28 сьнежня не зьявіўся адпаведны па Статуту Саюза лік паўнамоцнікаў, чароднае вальнае сабраньне склікаецца там-жа 29 сьнежня аб 11 гадзіне раніцы і яно будзе лічыцца правамоўным пры абы-якой колькасьці прыбыўшых на сабраньне паўнамоцнікаў.

Часовая Урадавая Камісія Вілен. Саюз. Каапэрат.

Паведамленьне.

Прафэсыянальны саюз рабочых безьзямельных і малазямельных Сярэдняй Літвы склікае на 26 сьнежня зьезд у Вільні прадстаўнікоў безьзямяльных і малазямельных сялян Сярэднай Літвы.

Кожная вёска і маёнтак мае права паслаць па два прадстаўнікі, а калоніі Ізраільскіх рабочых і фальваркі па аднаму. Прадстаўнікі павінны мець з сабою адпісы пратаколаў і ежы на два дні. Зьяўляцца павінны загадзя у канцэлярыю Саюза (Вільня, Віленская вул. № 12). На зьездзе будуць разглядацца гэткія пытаньні: 1) Справаздача кіраўніцтва саюза. 2) Выбары цэнтральнага бюро. 3) Бягучыя справы.

Кіраўніцтва Саюза.

Хто ня прыслаў яшчэ падпісных грошы за сьнежань (дзекабар), таго просім не пазьніцца, каб ня было задзержкі у высылцы газэты.

Што чуваць у сьвеце.

Новы хаўрус вялікіх дзяржаў.

Вашынгтонская канфэрэнцыя апублікавала фармальнае рашэньне аб заключэньні трактату паміж Амэрыкай, Англіяй, Японіяй і Францыяй аб забесьпячэньні агульнага міру, правоў падпісаўшых дагавор старонаў на іх землі і ўмацаваньні збройных сілаў. Срок згоды—10 гадоў.

Порт—Артур.

На Вашынгтонскай канфэрэнцыі былі перагаворы між Японскай і Кітайскай дэлегацыямі аб Порт- Артуру. Кітай дабіваецца, каб яму аддалі назад Порт-Артур, японцы не згаджаюцца, кажучы, што ён надта дорага каштаваў ім.

Вольная Ірляндыя.

Ангельскія газэты мяркуюць, што ірляндзкі парлямэнт большасьцю 2/3 галасоў зацьвердзіць згоду з Англіяй, да якой прыйшлі перагаворы ў Лёндане.

Ангельскі парлямэнт 14 сьнежня зацьвердзіў згоду з Ірляндыяй.

На паседжаньні ірляндзкага парлямэнта Грыфі, Батон, Колінз выказаліс за прыняцьце лёндаскага дагавора з Англіяй, а дэ-Валера, Стакэ, Брайт—супроць прыняцьця.

Другі сын ангельскага караля, князь Йорку, будзе назначаны генаральным губэрнатарам вольнай ірляндзкай дзяржавы.

Справа Домбаля.

Арыштаваны дэпутат Варшаўскага Сойму камуніст Домбаль абвесьціў галадоўку ў знак пратэсту супроць лішэньня яго волі.

Справа Савінкава.

Польскія газэты паведамляюць, што па вымаганьню савецкага ўраду Савінкаў мусіў выехаць і з Чэха-Славаччыны.

Савецкі параход.

ГДАНСК, 7 сьнежня 1921 г. (Славбюро). У порт Піляў (каля Кёнігсбэрга) прыплыў у першы раз расейскі параход „Карл Маркс" пад савецкім флагам. Параход мае кірунак з Штэтына ў Петраград з грузам зялезна-дарожнага матарыялу і сельска-гаспадарскіх машын. У Піляў параход забярэ з сабою амуніцыю і вайсковую маемасьць, забраную нямецкімі ўладамі ў перайшоўшых у жніўні 1920 г. нямецкую граніцу чырвонаармейцаў.

Паўстаньне у Карэліі

Фінляндзкі ўрад зьвярнуўся у Лігу Народаў з просьбаю, каб умяшалася ў справы Карэліі.

Чычэрын пратэстуе супроць умешваньня ў унутраныя справы Савецкай Расеі, прычым вельмі войстра вымагае, каб Фінляндыя перастала рабіць паўстаньне карэлаў.

Непарадкі у Чыкаго.

З Амэрыкі паведамляюць, што ў Чыкаго былі непарадкі. Бунтавалася каля 100.000 чалавек. Забіта паліцыяй 9 чалавек. Прычыны і падробнасьці яшчэ невядомы.

Штучнае золата.

„Intrasigeant" паведамляе, што знамяніты амэрыканскі вучоны Эдісон знайшоў спосаб рабіць штучнае золата.

Апошнія навіны.

— Плебісцыт у Шопроні адбыўся. За Угоршчыну пададзена 10.438 галасоў, за Аўстрыю 3.000. Шопронь прыпадае Угоршчыне.

— Нямецкі ўрад афіцыяльна паведаміў, што Нямеччына ня ў змозе заплаціць частку кантрыбуцыі за студзень месяц.

— Канстантынопальскі карэспандэнт газэты „Новое Время" паведамляе, што на Крыце выбухнула паўстаньне супроць грэкаў. На чале рэвалюцыянэраў стаіць Мінаракіс. Рэвалюцыянэры апанавалі сталіцу вострава.

Плебісцыт у Бургенлянду.

ПРАГА, 9 сьнежня 1921 г. (Славбюро). Першы транспарт войска хаўрусьнікаў прыбыў у Шопронь, каб спаўняць службу у часе плебісцыта.

Пратэст Аўстрыі.

Аўстрыйскі ўрад пратэставаў супроць назначэньня плебісцыту ў Шопроні на 14 сьнежня.

Венскі пралетарыят бунтуе.

Пад гэткім назовам зьмяшчае ўкраінская камуністычная газэта „Наша Правда", выхадзячая у Вене, такую заметку аб венскіх падзеях 1-га сьнежня:

1-га сьнежня, у сераду раптам спынілася праца і груды людзей выйшлі на вуліцу з галосным пратэстам супроць дарагоўлі. Болей за 100.000 чалавек ішло ў дэманстрацыі перад парлямэнтам. Галодня, абдзёртыя людзі кінуліся на крамы, банкі, гатэлі, кавярні, хапалі вопраткі, боты, хлеб, пабілі вокны, парвалі міліёны банкнотаў і патрышчылі мэблі. Дайшло да крывавых сутычак. Цэлае места замёрла"..

Пасьле завірухі ў Вене.

Аўстрыйскі прэм'ер Бэтлем сказаў праграмную прамову, падкрэсьліўшы, што бальшавіцкая небясьпека перастала істнаваць. Абмежаваньні грамадзянскіх свабодаў скасованы.

Румынія шукае грошы.

Румынскі ўрад зьвярнуўся да нацыянальнага банка з просьбаю пазычыць 500 міліёнаў леяў, але банк адмовіўся. Перагаворы румынскага ўраду з прамысловымі банкамі таксама скончыліся незадачаю. Тады ўрад Румыніі змушан быў зьвярнуцца да Францыі, якая маець яшчэ меней веры да румынскай гаспадаркі, але згаджаецца пазычыць Румыніі грошы на нязвычайна цяжкіх варунках.

Гандаль Расеі з Нямеччынай.

Рыская нямецкая газэта перадае паведамленьне намесьніка савецкага камісара заграйнічнага гандлю (внешторг), што тры группы нямецкіх банкаў адчынілі савецкаму ўраду крэдыт; гандлёвыя адносіны саветаў з Нямеччынай добра склаліся, але з прычыны паніжэньня нямецкай маркі, нямецкія фірмы трэбуюць заключэньня дагавору на чужаземную валюту.

Расея варочуець Польшчы вывезенае дабро.

Савецкае прэсовае бюро ў Варшаве паведамляе, што 6-га сьнежня выслана з Масквы ў Польшчу 47 вагонаў з польскай маемасьцю.

Італія і прызнаньне Савецкай Расеі.

З Рыму паведамляюць, што камісія заграйнічных спраў Італійскага парлямэнту пастанавіла запрапанаваць ураду, каб Італія прызнала Савецкую Расею.

Польшча і Расея.

Савецкі ўрад выслаў польскаму ўраду ноту, у якой адказывае на закіды ў справе неспаўненьня Расею абавязкаў, каторыя выпадаюць ёй з рыскага трактату.

Нота зазначае, што згодна з трэцім артыкулам рыскага трактату „Расея і Украіна з аднаго боку, а Польшча з другога боку згодзіліся, што справа прыналежнасьці да Польшчы і Літвы спрэчных тэрыторыяў падлягае выключна рашэньню між Польшчаю і Літвою.

Пераказаньне гэтае справы на рашэньне так званае „Лігі Народаў" — становіцца затое нарушэньнем рыскае ўмовы.

Апроч таго, артыкул другі рыскага трактату прадвіцзіць сувэрэнныя правы Літоўскай дзяржавы, як зусім роўнага контр-агента Польшчы.

Дзеля гэтага савецкі ўрад ня можа прызнаць згодным з рыскім трактам абніжэньне Літвы да ступені сфэдэраваных часьцін расшыранай Польскай дзяржавы.

АД РЭД. Зварочуем увагу чытаньнікаў, што ў той час, як Расея і Украіна па рыскаму трактату перадаюць справу спрэчных земляў на выключнае рашэньне Польшчы і Літвы, Беларусь і гэтага ня робіць, пакідаючы за сабою права на ўчасьце ў тым рашэньні.

Бальшавікі адбіраюць падданства.

Расейская рада народных камісараў пастанавіла пазбавіць права расейскага грамадзянства гэткія катэгорыі асобаў 1) што прабываюць заграніцаю больш, як 5 гадоў, 2) што выехалі без пазваленьня савецкіх уладаў з Расеі пасьля 1 лістапада 1917 году; 3) што бралі учасьце ў контр-рэвалюцыйных арганізацыях і 4) што не скарысталі з належнага ім права оптацыі.

Дзевяты Кангрэс Саветаў.

Старшыня Усерасейскага Цэнтральнага Камітэту Калінін паслаў вось такі заклік па тэлеграфу незалежным радзянскім рэспублікам і Далёка-Усходняй Рэспубліцы:

„Да брацкіх і садружных рэспублік Азэрбэйджану, Арменіі, Беларусі, Бухары, Грузіі, Харазіі, Украіны ды Далёка-Усходняй Рэспублікі. Прэзыдыум Усерасейскага Спаўняльнага Камітэту паведамляе вас, што Дзевяты Усерасейскі Кангрэс Саветаў адбудзецца ў Маскве 20 сьнежня 1921 года, і мае гонар прасіць вас, як суседнія брацкія рэспублікі, паслаць сваіх прадстаўнікоў гасьцямі на гэты кангрэс". („Наша Правда").

Баі у Альбаніі.

ПАРЫЖ, 16 сьнежня (А В). Сюды наказуюць аб заўзятых баёх, якія йдуць ў Альбаніі між альбанскімі і юга-славянскімі аддзеламі.

Амністыя Ірляндцам.

Лік ірляндцаў, якім дадзена амністыя, перавышае 4 тысячы чалавек.

Аўстрыя і савецкая Украіна.

Аўстрыя прызнала Савецкую Украіну.

Забастоўка у Вене.

7-га сьнежня ў Вене ізноў началася забастоўка. Прычына—заработная плата.

Паравозы для Расеі

У Рэваль прыбыла новая партыя нямецкіх паравозаў для Расеі.

Пажар з.-д. майстэрняў у Варшаве.

„Варш. Откл." паведамляюць, што 15 сьнежня згарэлі ў Варшаве зялезна-дарожныя майстэрні Усходняга вакзала. Страты вялікія.

Землятрасеньне ў Японіі.

З Токіо паведамляюць, што ў Японіі было вялікае землятрасеньне, якое нарабіла дужа многа шкоды і пакалечыла людзей.

Справа Віленшчыны.

Француская прэса аб Польшчы ў Віленскім пытаньні.

„Era Nouwelle" і далей крытыкуе Польшчу ў Віленскім пытаньні. Надоячы гэтая газэта зьмесьціла пратэст ураду Незалежнае Літвы супроць дэкрэту ген. Жэлігоўскага аб выбарах, апроч таго, у вялікім артыкуле яна даводзіць, што Польшча зрабіла няправільна ў Віленскім пытаньні. Артыкул гэты пералічае ўсё, што было зроблена дагэтуль для бесстароннага плебісцыту, і вымагае, каб была зьвернута сур'ёзная ўвага на выбары ў тым прыпадку, калі-б яны прайшлі на карысьць Польшчы. Гаворачы аб тым, што ліцьвіны і беларусы пастанавілі узьдзержыцца ад галасаваньня пад польскай акупацыяй, газэта паўтарае словы Гіманса на агульным сходзе Лігі Народаў: „Народ, зямля якога астаецца пад вайсковаю акупацыяю, ня мае магчымасьці выказаць сваю волю. Пад гнётам штыхоў няма незалежнае развагі".

Вольная агітацыя пачынаецца.

(З аднаднёўкі „Беларускі Голас").

ЗАЛЕСЬСЕ, Беніцкай гміны Ашмянскага павету.

9 сьнежня г. г. у нашу воласьць раптоўна, кажуць, што з Вільні, прыехаў атрад паліцыі, лікам каля 30 чалавек. Чаго і зачым прыехалі, ніхто ня ведаў і цяпер ня ведаем. Знаем толькі добра, што ў Залесьсі, Ардзеі, Аленцы, Вётахаве і іншых вёсках зрабілі шчыльныя вобыскі, навет у кублы заглядывалі, потым арыштавалі каля 30. а можа і болей нашых аднасельчан, панастаўлялі ім сінякоў і гузоў і адправілі ў Ашмяну. Сярод арыштаваных знаходзіцца селянін Русак, калека, якому 80 гадоў, і моцна зьбіты вучыцель пачатковае беларускае школы ў Вёталаве Янка Дудка. Злыя языкі кажуць, што гэта ад таго, што нашы сяляне ня хочуць выбіраць у панскі сойм. І праўда, хто-ж адважыцца выбіраць у сойм пры такой „вольнай" агітацыі? Калі цяпер нас б'юць, то што-ж будуць рабіць з намі, калі зьбяруць Сойм?

Выбаршчык.

Літоуськія справы.

Адстаука Пурыцкіса.

Літоўскі міністар заграйнічных спраў Пурыцкіс падаў заяву аб адстаўцы. Адстаўка прынята

„Głos Litwy".

Ізноў стала выхадзіць літоўская газэта на польскай мове «Głos Litwy", зачыненая 11 верасьня ўладаю Сярэдняе Літвы. Падпісуець газэту віднейшы літоўскі дзеяч у Вільні п. Міхал Біржышка.

Украінскія справы.

Цюцюнік у Львове.

Як паведамляе „Славбюро", кіраўнік паўстаньня Цюцюнік, пасьля няўдачы пад Алеўскам перайшоў польскую граніцу і жывець цяпер у Львове, дзе знаходзіцца і яго сям'я.

Украінцы і Вашынгтонская Канфэрэнцыя.

„Укр. Слово" паведамляе, што ўкраінцы з Усходняй Галіцыі рабілі ў Вашынгтоне захады, каб іхная дэлегацыя была прынята на канфэрэнцыі.

„Чэрвона Правда."

У Камянцы пачала выхадзіць украінская газэта „Чэрвона Правда", орган Камуністычнай Партыі Украіны. („У. С.").

Розныя весткі.

— Паводлуг даных міністра фінансаў за 1921 г. Нямеччына мае 161 мільярд 241 мільён дэфіцыту.

— Як аблічыў міністар фінансаў, дэфіцыт Польшчы за бягучы год дасягае 180 мільярдаў, які мае быць пакрыты дзяржаўным падаткам.

— У Варшаве арыштаваны вядомы сыяніцкі дзеяч д-р Пэкер.

— Польскі ўрад згадзіўся на заключэньне гандлёвага дагавору з бальшавіцкай Расеяй і Украінай.

Новае назначэньне п. Оліньша.

Прадстаўнік Латвіі ў Польшчы п. Петэрс Оліньш неўзабаве выяжджае з Варшавы ў Рыгу, бо займець там пасаду міністра заграйнічных спраў. П. Оліньш знаём з беларускім рухам і спагадаець яму.

Жудасная доля паварочаных уцекачоў.

Дэмакратычная польская газэта „N. Dziennik Białostocki" зьвярнулася да жыхароў з гарачым заклікам прысьці на помач уцекачом, якія цяпер прыяжджаюць з Расеі.

„N. Dziennik Biastocki" у сваёй адозве кажа, што ўцекачы едуць ад Баранавіч, ад Роўна па 4 дні й начы ў сьцюдзёных, брудных вагонах, галодныя, голыя. Па дарозе на кожнай станцыі санітары выносяць з вагонаў скасьцянелыя трупы матак, дзяцей, старых.

Прыехаўшы да Беластоку, чуць жывыя ўцекачы туляюцца па месьце, шукаючы стравы і прыпынку. Пераважаючая частка ўцекачоў мусіць перайсьці яшчэ цераз пекла, якім ёсьць этап Эміграцыйнага Ураду ў казармах ім. Траўгута, гдзе ім прыходзіцца ў самым агідным палажэньні сядзець па некалькі дзесяткаў сем'яў у Белым і Чырвоным бараках або ў нятэпленай драўлянай пуні — Чорным бараку. Пад бокам у жыхароў Беластоку гэтыя няшчасныя ўміраюць з голаду, мерзнуць, іх ядуць паразіты. Многія з іх вярнуцца да сваей вёскі ня могуць, бо там усё папалена.

На помач уцекачам „N. Dziennik Białostocki" адкрыў складаньне ахвяр.

2402-1

УСІХ, ЗНАЮЧЫХ АДРЭС ДАЧКІ
Фёдара Міхайлавіча Дастаеўскага
ЛЮБОВІ (цяпер знаходзіцца ў ЗаходняйЭўропе) пільна просім прыслаць яго ў рэдакцыю „Белар. Ведам." (Wilno, Ostrobramska 9) або паказаць пеўны спосаб пераслаць ёй пісьмо.

Жыцьце у Савецкай Беларусі.

(Па ведамасьцях менскіх газэт).

Паэзія.

1. НОВАЯ ЖАЛЕЙКА.

Дзіўная рэч нам зьявілася:
Мары ўвайшлі у жыцьцё,
З краем маё аднавілася
Сэрца і з ім пачуцьцё.
Смутныя струны, парвіцеся,—
Годзе вам жудасна ныць.
Больш ужо, сьлёзы, ня ліцеся:
Сонейка шчасьця блішчыць,
Кіну жалейку журботную,—
Стала ў жыцьці нам сьвятлей,
Кіну я песьню маркотную
І заспяю весялей.
Зраблю жалейку я новую,
Жыцьця сяброўку маю,
Сэрцам вясёлым маёвую
Песьню аб волі сьпяю.

(„С. Б." № 368) Я. Журба.

2. ПЕСЬНЯ ВОЛІ.

Ты адна з мацнейшых песень,
Песьня Волі, песьня Працы;
Ад цябе ўжо сьвет стаў цесен
Тым, што жылі у палацах...
А пяём ў адзін мы голас,—
Будзе час—зацягнем хорам,
Дыбам стане у іх волас,—
Нам засьвеціць шыр прастору.
Дык ты лійся, ня ўнімайся!
У хаце курнай на палацях,
У кузьні з іскрай рассыпайся,
Заві к Волі, Шчасьцю, Працы!
Адганяй патугі гора
І будзі змагацца брата;
Будзь, як хваля вечна мора,
Глыбінёй сваей багата;
Будзь уцехай пры змаганьні,—
І душа твая—люстэрка
Дасьць нам шчасьце, панаваньне
І адчыніць к волі дзьверкі.
Як вясна прыветным пахам
Аднаўляе жыцьце вёскі—
Ты ляці арлiным ўзмахам
У край той сьпячы, адзінокі.
Асьвяці пуціну к Волі
Бляскам сонца на прадвесьні,
Зглушы, гора і патолі,—
Будзь-жа вольнай вечна, песьня.

(„С. Б." № 367) А. Гурло.

Быт.

1. ТЭАТРАЛЬНАЯ ПУБЛІКА.

„Каму прыходзілася быць апошнія часы на пастаноўках п'ес у Дзяржаўным Тэатры, той напэўне заўважыў, што вельмі шмат у Менску ёсьць хворых грамадзян. Асабліва лік хворых павялічыўся на апошняй пастаноўцы „Цені", якая прайшла пад акампанімэнт кашлю. Вось гэта самая хвароба-кашаль, праўдзівей сказаць, нейкае нясумленнае падкашліваньне, і зьяўляецца ў нас чарговай і новай хваробай пасьля гішпанкі.

Калі-б ня бачыць перад сабою сцэну з рухамі артыстаў, то здавалася-б, што сядзіш ня ў тэатры, а ў больніцы сухотнікаў. Калі гэта запраўды нападае кашаль толькі „тэатральны", ня фізычная хвароба, а духоўная, то выбачайце, грамадзяне, ад яе пара ўжо вылячыцца самім, бо могуць вельмі дрэнныя рацэпты паднесьці вам тэатралы.

Мне ня думаецца, што гэта запраўдны кашаль. Бо варта аднаму толькі кашлянуць з нецярплівосьці, напомніць, што кашаль ёсьць, як зараз жа саўсіх куткоў панеслася гэта музыка. І гэта дзе? У храме мастацтва... А што-ж, вы думаеце, што артыстам прыемна іграць пад гэтую музыку? Хоць я і не артыст, але мне здаецца, што ў артыста ў гэты час бывае такі настрой, што ўхапіў бы бутафорыну і запусьціў-бы ў публіку, якая не паважае ня толькі яго, як слугу мастацтва, але і самога мастацтва.

Ня дужа прыемна слухаць гэты кашаль людзям здаровым, якія можа з за сваей убогасьці маюць магчымасьць раз у месяц купіць білет, каб пабачыць і паслухаць тую ці іншую п'есу.

Няўжо вы хочаце, „хворыя грамадзяне", каб вам на афішы адміністрацыя пісала, чаго ня можна рабіць у тэатры? Няўжо вы хочаце, каб к таму лёзунгу („ня можна ў тэатры грызьці семячак"), што красуецца ўнізе афішы, яшчэ напісаць, што ў тэатры забараняецца :„кашляць", „пляваццa", „курыць", „ламаць дрэвы", „катацца на веласыпэдах", „пушчаць сабак" і г. д.

Здаецца, „хворыя" грамадзяне, пара ўжо самім ведаць, што можна і што ня можна, каб на кожным кроку вам ня прыходзілася напамінаць; даўно час вылячыцца ад тэй хваробы, якая мае мейсца ў добрым здароўі."

(„С. Б.") Здаровы.

2. АКАНОМЫ І ПАСТУХІ.

З м-ка Узда Ігуменскага павета паведамляюць („Бел. Дер." № 62):

„Есьць ў Узьдзенскай воласьці вялікі савецкі двор. Мяркуючы па абхаджэньню аканома „пана Ягодкі" з работнікамі, якіх налічаецца блізка 50 чалавек, можна падумаць, што двор падаўнейшаму належыць князю Радзівілу. Ен заўсёды ходзіць з бізуном, каторым гразіцца на ўсіх работнікаў. Лаецца самымі астатнімі словамі. Не ўважаючы пастуха Якімовіча за роўнага сабе, ён яго за тое, што той зьвярнуўся да яго на „ты", аблаяў як мог і перавёў на другую работу. Ен гадуе ўласную карову і каня на савецкім корме. Малако бярэць ад савецкіх кароў. Чаму гэта робіцца і чаму за гэтым ніхто ня пільнуе?"

3. СТАРШЫНЯ.

(Сяло Акцябрскае, Бабруйскага пав.).

„Разьмеркаваньне сенакосаў у павеце ня ўсюды прашло гладка. Некаторыя кіраўнічыя сельскіх саветаў, кіруючыся сваёй „уладай", бралі сабе львіную частку. У Рудзенскім сельскім павеце Акцябрскай воласьці старшыня сельскага савету дахітрыўся ўзяць сабе па 4 пуды на кожную галаву жывёлы, тагды калі простыя сьмяртэльныя атрымалі толькі па 2 пуды. Справа вышла наверх, дзякуючы аднаму з грамадзян, які скардзіўся ў Рабоча-Сялянскую Інпэкцыю і Народны Суд. Але адрыгнулся „сель-саветніку". Акцябрскі валасны выканаўчы камітэт звольніў яго ад пасады, прыгаварыўшы к бязвольлю з прыцягам да грамадзянскай прымусовай працы і абвясьціў яму ганьбоўнасьць на зьезьдзе сельскіх саветаў воласьці."

Школа.

ВЫПУСК НАСТАУНІКАУ.

(М. Дукора, Ігуменскага павету).

„У памяшчэньні прыкладнай школы пры савецкай гаспадарцы адбылося урачыстае зачыненьне першых каротка-тэрміновых пэдагагічных курсаў. Выпушчана 35 настаўнікаў. Ва ўсіх прамовах чулася добрае жаданьне маладым школьным працоўнікам на выбраным імі шляху працы. У дзень зачыненьня курсаў пастаўлен *спэктакль-канцэрт на беларускай мове* на карысьць папраўкі-памяшканьняў школ. Чыстага прыбытку спэктакль даў 9.195.000 руб. Грошы перададзены ў валасны аддзел народнай асьветы."

2. ШКОЛА У КОЖНАЙ ВЕСЦЫ.

(С. Акцябрскае, Бабруйскага пав.).

Зьезд сельскіх саветаў Акцябрскай вол. пастанавіў адчыніць школы ва ўсіх вёсках Памяшканьні для школ павіны падшукаць самі сяляне.

3. ЗМАГАНЬНЕ З НЯПІСЬМЕННАСЬЦЮ.

(С. Цытва, Ігуменскага павету).

Ва ўсёй Цытвянскай воласьці пачата зьнішчэньне няпісьменнасьці. У самай Цытве ўжо працуе школа граматы для дарослых. Адчуваецца няхват у кніжках і іншых школьных прыладах, што крыху затрымлівае працу па зьнішчэньню няпісьменнасьці.

4. ВУЧЫЦЕЛЬ-БЫУШЫ ПАЛКОУНІК.

З Бабруйскага павету паведамляюць („Бел. Дер." № 62):

„У вёску Дварановічы, Бортнікаўскай воласьці, прыбыў вучыцель—бышы палкоўнік Гаўрылаў. Калі пачаліся заняткі ў школе, вучыцель Гаўрылаў сказаў па зборцы, каб яму сяляне сабралі з кожнага вучня па 15 ф. мукі і па 1 пуд. бульбы, а калі не сабяруць, дык ён я будзе вучыць. Вучням ён загадаў, каб яго звалі „пан вучыцель", а калі будуць называць „таварыш вучыцель", дык таго вытурыць са школы. Апроч таго, вучыцель паклапаціўся павесіць у школе абраз"...

Карэспандэнцыя азагалаўлена: „Такіх вучыцялёў трэба гнаць!"

Збор харчовага падатку.

НА 40 ПРОЦАНТАУ БОЛЬШ ЗА НОРМЫ.

Першая у Бабруйскім павеце па выпаўненьню харчовага падатку на жыта лічыцца Сьвіслацкая воласьць, якая здала да 1 лістапада 141 процант жыта.

2. ЗА УТАЙКу РАЛЬЛІ.

У рэвалюцыйным трыбунале Н-й дывізіі разглядалася справа жыхароў Слабоцкага, Каменскага, Чмелеўскага сельскіх саветаў Зембінскай воласьці Барысаўскага павету, вінавачаных ва ўтайцы ральлі і жывёлы з мэтай ухілу ад харчовага падатку. Трыбунал прызнаў, што многія грамадзяне гэтых сёл паказалі менш ральлі, як ў іх ёсьць. Трыбунал зьвярнуў увагу, што ўтайка ў Барысаўскім павеце мае паўсямесны характар, што гэта віна ўсё роўна, як крадзеж, бо грамадзянін, утаіўшы пляц ворнай зямлі, тым самым адбірае крошку хлеба ў галоднага брата Паволжа. Лічачы адсутнасьць дастатку асьветы ў вінавачаных, пастанавіў а т а б р а ц ь у а с у д ж а н ы х п а к а р о в е з с ы с к а н н е м х а р ч а в о г а п а д а т к у ў д в о й н ы м л і к у!

Разам з гэтым, трыбунал даручыў Зембінскаму Выканаўчаму Камітэту праверыць па усёй воласьці пляц ральлі і іншых відаў абкладкі і потым склікаць старшынь сельскіх саветаў, якія адказуюць за своечасовы і поўны лік харчавога падатку. Усе павінны палягчы сіламі, каб споўніць сваю павіннасьць перад Рэспублікай і выратаваць ад голаду сялян і рабочых Паволжа.

3. ХАРЧОВЫ ПАДАТАК У БАБРУЙСКІМ ПАВЕЦЕ.

На 1 лістапада атрымалася па харчовому падатку: 147700 пуд. жыта (70%), 44250 пуд. аўса (57%), 15525 пуд. бульбы (60%), 19756 пуд. льняного семя (85%), 1628 пуд. масла (26%), 291912 шт. яек (77%), 957 пуд. воўны (101%) і сена—88852 пуд. Льняное семя здавалася ў лік масла, чым і тлумачыцца такі вялікі процант выпаўненьня. Яшчэ за паветам засталося нявыпаўнянага падатку: 30 процантаў на жыта, 40 процантаў на бульбу і інш.. Галоўнымі павіньнікамі засталіся 4 воласьці: Бортнікаўская, Любоніцкая, Гарбацэвіцкая і Качэрыцкая, выпаўняўшыя толькі 48—49 процантаў. У адносінах да іх прыймаюцца надзвычайныя меры сысканьня.

4. ШТО САБРАНА У СЛУЦКУ.

У Слуцкім павеце да 1 лістапада сабрана—жыта і пшаніцы 79 процантаў, усяго—178.443 пуд., аўса і ячменю 58 процантаў, усяго — 934022 пуд. грэчкі і пшана 86 процантаў, усяго—1542 пуд., бульбы 86 процантаў, усяго — 129411 пуд., масла 2053 пуд. сена 41 пр., усяго 75679 п., яек 45 проц, усяго — 280960 шт., воўны 829 процант., семя—179.967 пуд., рагатай жывёлы — 27'677 пуд., авечак—423 пуд. сьвіньней —220 п.

Помач галадуючым.

1. САБРАЛІ 12 МІЛЬЕНАУ.

Адбышыся у Белай Салі вечар, арганізаваны Саветам Народнай Гаспадаркі Беларусі, на карысьць галадуючым Паволжа даў чыстага прыбытку звыш 12 міліёнаў руб.

2. ХУТАРЦЫ — ГАЛАДУЮЧЫМ.

(Ігуменскі павет.)

Хутарская валасная камісія дапамогі галадуючым сабрала: бульбы — 206 пуд., жыта — 110 п. круп — 18 пуд., гароху — 2 пуд., аўса — 3 пуд., маслянага семя 1 пуд., цыбулі 1 пуд. і грашыма каля —300000 руб.

3. МІЛІЦЫЯНЭРЫ ПАВОЛЖУ.

Ахвяраваньні 3 раёну міліцыі Заходняй чыгункі да лістапада г. г. лічацца ў 340 п. 16 ф. мукі жытняй, 38 ф. круп, 35 п. 26 ф. фасолі, 6 ф. 24 зал. рыбы, 1 п. 30 ф. цукру, 1 п. 30 ф. солі, 35 ф. масла (алею) і інш.

Усе харчы зданы ў павятовую харчовую ба-

Прыпеўкі.

1. Ах ня ўмееш, ах ня ўмееш,
Што пасееш, паліваць:
Падвадзіў мяне да дому,
Ды ня ўмеў пацалаваць...
2. Каб ты добрынькі быў,
Дык прышоў-бы ка мне—
На часінку пагуляць,
Мне прыпевачку сьпяваць.
3. Ах сонейка, сонейка!
Закаціся скоранька.
Мой міленькі, мой харошы,
Скінь боцікі, прыдзі босы.
4. У гародзе ня лясе
Тры гарошынкі,—,
Ен мяне пацалаваў
Ен—харошанькі!
5. Цераз рэчку жэрданька...
Баліць маё сэрданька:
Клічу мілага—ня чуе,
Не вядома, дзе начуе.
6. Няма яблынкі пры плоце—
Недзе яблычак сарваць:
Няма мілага на йгрышчы—
Няма з кім і пагуляць.
7. Я вадзічку нясу—
Каромысьлік гнецца...
А мой любы на мяне
За нештачка дзьмецца!
8. Як учора—дык і бусінькі,
А сягоньня—нічагусенькі,
Як учора--дык заручку вядзець,
А сягоньня—дык ня хоча глядзець
9. А Божа-ж мой ядыненькі,
Не гаворыць мой міленькі;
А Божа мой, што рабіць?
Перастаў мяне любіць!
10. Пакараець, пакараець,
Не даруець яму Бог:
Не адну мяне ён любіць,
А на леце, можа, трох...
11. Завьнібела маё сэрца,
Я ня ведаю, чаго?
Я ня відзела мілога,
Дык нягож-та за яго?
12. Паразмые, паразмые
І крутыя берагі...
Маё сэрца ные, ные...
Па табе, мой дарагі!
13. Закацілась ясна сонца,
Перастала цёпла грэць,
Аддаліўся мой міленькі
Перастаў мяне жалець.
14. Дробны дождзжык ідзець,
Раса ападаець...
Любіў мяне маладую,-
Цяпер пакідаець...
15. Не знайці такой бярозы,
А каб дождж не памачыў;
Не знайці такой любові,
А каб хто не разлучыў.
16. А у садзе жоўты цьвет
Зімы не баіцца;
Праз людзкія языкі
Кінулі любіцца!
17. Любіліся, кахаліся,
Як ластаўкі ў стрэсе...
А сягоньня разыйшліся,
Як ягадкі ў лесе...
18. Крыкнула вутка—
Сярод мора чутка.
Гукнула дзяўчынка перавоз—
Я-б яе на ручках перанёс...
19. Колькі зорачак на небе,
Адна зорачка гарыць:
Есьць і гожых і прыгожых,—
Па аднэй сэрца баліць.
20. А Божа мой, сэрца рвецца,
Што дзяўчына не гарнецца.
А Божа мой, што рабіць:
Ні пакінуць, ні любіць?!
21. Дробны дождзжык ідзець—
На ганачку гразка...
Любіў, любіў дзяўчыначку
І растацца цяжка!
22. А дзе-ж тая бярэзінка,
Што я вецьце ламаў?
А дзе-ж тая дзяўчыначка,
Што я сёлета гуляў?
23. Даўно-ж тая бярэзінка,
Ужо й вецьцем абрасла!
Даўно-ж тая дзяўчыначка
За нялюбага пайшла.

Пісьмо з Вільні.

Дарагі Вінцэська!

Пытаешся ты, якія навіны ў Вільні. Я, дапраўды, ня маю часу зьбіраць навіны, і пісаць мне цяжка. Чалавек напрацуешся, як той кажа, як чорны вол. Ага! Я чуць не забыўся напісаць табе найважнейшай навіны: я нядаўна паступіў за стоража на Віленскай вуліцы, номеру навет ня буду пісаць, бо ты ўсё роўна забудзешся. Як будзеш ехаць да Вільні, дык выбірайся такім поездам, каб рана быць на вагзале. Тады ідзі праз Нямецкую вуліцу, мінеш завулак, што ён цяпер называецца „3-га мая", дык ты ужо будзеш на Віленскай вуліцы; ідзі проста, а я што дзень рана падмятаю вуліцу,—вот мы і спаткаемся! Я маю кватэру ў сутарэне, як табе растлумачыць,-ну, як бы ў склепе, два вакны на вуліцу. Нізка, сыра, цесна і цёмна; адпусьці, Божа, грахі: як у чысцы тым. Жонка табе кланяецца. Яна цяпер у касьцеле на рэкалекціях, бо мая жонка запісаўшыся да тарціярства. Многа было з гэтага сьмеху, але аб гэтым хіба калі посьле напішу, бо сягоньня ня маю часу. Трэба яшчэ вады прынясьці таму пану, што жыве на другім пёнтры. Гэты пан нейкім вялікім чыноўнікам служыць; бараду ўжо мае сівую, але жонкі ў яго нямашака. Я маю двое дзяцей: сын 10 гадоў і дачка 7 гадкоў. Сын называецца Андрэй і ходзіць у беларускую гімназію, што яна каля Вострай Брамы. У гэтую гімназію мяне намовіў нейкі лысы пан, што жыве тут недалёка, на Віленскай вуліцы, номер усё роўна ты забудзешся, а называецца той пан—Пяткевіч. Жонка са мною спрачалася аб тую гімназію, чуць мы не пабіліся. На яе нейкі ксёндз, я забыўся яго фамілію, крэпка насварыўся на споведзі. Але я тыкі упёрся: ужо мой Андрэйка у першай клясе; а чытае, каб ты чуў, дык мусіць дзіваваўся б. Ой! званок: мусіць варочаецца той паніч, што ў клюбе у карты іграе: ён ужо трэці раз мне нічога не дае, дык няхай падла пачакае. Звані, звані! каб ты зубамі званіў! Няхай яго немарасьць; трэба адчыніць: шкода гіцля, каб не перамёрз: Бывай здароў, Вінцэська! Жонка табе кланяецца, а яна яшчэ не вярнулася з рэкалекціяў.

Твой Сымон з Вільні.

Удосьвецьця.

Доўга цягнуцца зімовыя досьветкі.

Гэты час — найлепшая пара для разьвіцьця нашае народнае паэзіі і пераказаў старыны.

Цэлы год прабыў я парабкам у заможнага хадзяіна (тут слова „гаспадар" ужо забыліся) ў захалусьці Смаленскае губэрніі і з найбольшай прыемнасьцю спамінаю якраз бясконцыя зімовыя досьветкі.

Дзед казаў казкі і розныя прыгоды з даўнай мінуўшчыны. Ад яго, майго любага старога дзядулькі Анупрэя, чуў я гісторыі з часоў прыгоншчыны, сьпісаныя ў „Панскай сучцы" „Прысязе", „Асілку", „Прыгоне" і іншых апавяданьнях.

Яго старэйшы ўнук, дваццацёх-галовы хлапец Гаўрыла, часта перабіваў нам ціхую, стройную плынь казаньня й слуханьня.

Маладая душа заўсёды бунтавала супроць пакоры падданых паном.

— А каб на мяне, — казаў Гаўрыла, — то ўзяў-бы я добры кол, падсьцярог-бы пана дзе-небудзь у зручным куточку ды так-бы сьвіснуў яго пэўху, што ён-бы і сваіх не пазнаў! Ня стаў-бы другі раз сячы людзей.

— Гаўрылька, Гаўрылька!--усьмяхаецца дзед, — лацьвей табе цяпер казаць, ня тое было у даўны час. Быў у нас гэткі адзін: Бывала, як яго сячы, возьмець кол, станець у кут і крычыць: „Палезьце толькі! Першаму растаўку магзаўню". А погым уцячэць у лес і басьцяецца там дзён дзесяць. Але што-ж? Ня дзе-ж яму дзецца, вернецца. Схопяць яго зьнянацку адзаду, зьвяжуць, пакладуць на зэдаль. Пара людзей сядуць на ногі, пара на галаву, а трэцяя пара з двух бакоў так адхлешчуць беднага, што посьле яшчэ дзён дзесяць ляжыць ды стогнець.

— Каб усе не даваліся, як ён, то не абсеклі-б.

Дзед толькі засьмяецца і кажаць далей перарваную гісторыю.

— А каб на мяне — ізноў замінаець Гаўрыла, — узяў-бы я карабочак серчыкаў і добры пук саломы, выбраў-бы я цёмную восеннюю ноч і такбы засьвяціў у панскім двары, што пан той і сваіх-бы не пазнаў.

— Гаўрылька, Гаўрылька! — усьмяхаецца дзед — лацьвей табе цяпер казаць, ня тое было ў даўны час. Быў у нас гэткі адзін. Бывала, як толькі восень, — гарыць гумно ў нашага пана. Згарэла раз, паставіў цераз год другое. Згарэла й тое, паставіў трэцяе. А посьле прыехалі к пану казакі, сагналі ўсіх людзей у двор, выбралі ад кожных дзесяцёх сямействаў па чалавеку, разлажылі іх голых на таку у тым гумне. Прыйшоў пан, запаліў сьвечку увелькі з добрую кацелку і ну па радоўцы падсмаліваць задраныя бароды, а таксама і іншае валосьсе. Ды й пытаецца: „Ня ведаеш, пераз чый грэх спалілася гумно у твайго пана?" — „Ой, паночку, зьмілуйцеся, ня ведаю". Абыйшоў усіх, а ляжалі ў два рады, як снапы,—і ніхто ня ведае... — „Ну, то, — кажаць, — як вы такія сьвятыя, што ніхто з вас ня маець грэху, — царства вам нябеснае!" Выйшаў з казакамі за вароты, сказаў заперці там нягрэшных і запаліць і гэтае гумно.. Божухна-Бацюхна! Пан багаты, што яму значыць спаліць гумно (пустое, бяз хлеба) і страціць сотні дзьве падданых, калі ў яго лесу таго за колькі дзён вокам ня скінуць, а падданых не адна тысяча. Завылі ўсе людцы, што стаялі вонках, кінуліся да пана, але ня з кольлем, а з гарачымі сьлязьмі, каб ня губіў невінаватых. Плачуць, галосяць, поўзаюць наўкол пана па зямлі, як ракі або чэрві.

— „Запалівайце!—крычыць пан, — мае людзі, мой адказ!" Хацелі ўжо казакі паліць, аж крычыць з гумна адзін: „Мой грэх!" Выпусьцілі ўсіх, а яго зьвязалі і павезьлі некуды скрозь ноч. Дзейкалі людзі, што спаліў яго пан у лесе. Можа праўда, можа—не, толькі ўжо ён прапаў нейдзе навекі, ніколі не вярнуўся. А начальству пан сыпнуў грошы, каб ня слухала людзкіх дзейканьняў і ня шукала чалавека. Сам-жа пан быў і начальнік.

— Каб усім кагалам кінуліся на пана й казакоў, то не прапаў-бы чалавек,— сьпіраецца задуманы Гаўрыла.

— Гаўрылька, Гаўрылька! — ківаець галавою дзед: — паглядзім, што-то будзець з вас, маладых!

Доўга цягнуцца зімовыя досьветкі.
Яшчэ далёка да сьвітаньня.. М. Гарэцкі.

зу павятовага камітэту харчаваньня Беларусі, а адлічэньні з пэнсіяў — у скарбніцу Народнага Камісарыяту Грашовых Спраў у ліку 5.986.406 рրб.

Бальшавіцкі Кавалер.

«Бел. Дер.» паведамляе:

„Старшыня валіспаўкома Гарбацэвіцкай валасьці таварыш Гарбузоў за ўбіўства галавара банды—Сінкевіча, за разгон бандытаў у Гарбацэвічах, паліткамісыяй Бабруйскага баявога вучастка прадстаўлен к ордэну Чырвонага Знамя.“

Апавяшчэньне Беларускага Нацыянальнага Камітэту.

З прычыны паяўленьня ў газэтах абвестак аб так-званым „Зьезьдзе Заходняе Беларусі“, які адбыўся ў Вільні 11 і 12 сьнежня г. г. Беларускі Нацыянальны Камітэт, як адзінае прадстаўніцтва ўсяго арганізаванага беларускага грамадзянства, гэтым падае да агульнага ведама ніжэй пісанае:

Сказаны зьезд быў склікан не якой-колечы беларускай нацыянальнай установай, а так-званай, Краёвай Сувязьзю, у каторай арганізаванае беларускае грамадзянства не прадстаўлена;

На зьезд ня толькі ня былі запрошаны ніякія беларускія грамадзкія арганізацыі, але навет прадстаўнікі іх, якія памыкаліся пранікнуць на зьезд, былі груба выдалены, ды некаторыя навет пабіты арганізатарамі „Краёвай Сувязі“ і зьезду;

Зьезд складаўся не з прадстаўнікоў шырокіх масаў Беларускага Народу, а выключна з прадстаўнікоў лёкальных арганізацый тэй-жа „Краёвай Сувязі“ і асоб, пэрсанальна запрошаных агентамі „Краёвай Сувязі“.

Іншыя з вучасьнікаў зьезду запрашаліся на яго як-быццам выключна дзеля школьных спраў; напраўдзе-ж зьезд насіў ярка палітычны характар.

На самым зьезьдзе ўчасьнікі тэрорызованы арганізатарамі, і тыя, хто быў западозраны у няпрыхільнасьці да палітычных мэт „Краёвай Сувязі“, ня толькі не дапускаліся да голасу, але навет пазбаўляліся зацьверджаных ужо мандатаў і груба выдаляліся з салі зьезду;

Такім парадкам зьезд, шумна названы „зьездам Заходняе Беларусі“, зьяўляецца зьездам арганізацыі „Краёвай Сувязі“, і пастановы яго ні ў якім прыпадку ня могуць быць прызнаны за голас беларускіх народных масаў Заходняе Беларусі.

Якім будзе Віленскі Сойм?

Пасьля адмовы беларусаў, ліцьвіноў і жыдоў ад выбараў у Віленскі Сойм, стала зусім ясна, якім гэты Сойм будзе.

І гадаць няма аб чым — Сойм у Вільні будзе ад нізу да верху польскім,—больш польскім, ніж Варшаўскі польскі Сойм, ніж кожная паасобная вёска самай польскай мясцовасьці самай каранной Польшчы. І гэта будзе найлепш сьведчыць, якую вартасьць Віленскі Сойм будзе мець у вачох нашых і ўсяго сьвета. Навет, калі і дапусьціць, што яўрэйскія камуністы пад фірмаю „Бунда“ пойдуць на выбары і правядуць пару-другую сваіх прадстаўнікоў у Сойм... калі і п. Аляксюку пры энэргічнай помачы з боку зацікаўлявых высокіх сфэр удасцца правесьці самаго сябе і яшчэ мо аднаго-двух (вельмі сумляваемся ў гэтым) сваіх падпявалаў, — то што-ж гэта будзе значыць? Ці можна будзе з гэтага зрабіць той вывад, што у выбарах вучаствавалі і яўрэі і беларусы.

Не!..

Гэта будзе значыць, што сучасная афіцыяльная польская палітыка аканчальна правапіла ў нашым краі польскае дзела.

Ці-ж гэта ня самы траскучы правал, калі на зварот і прызыў польскай улады да яўрэяў, адзываюцца толькі бундаўскія камуністы, якім ходзіць не аб супольнай працы з сучаснай Польшчай, а якраз наадварот — аб барацьбе з сучаснай рэакцыйнай Польшчай да яе зьніштажэньня. Ці-ж гэта ня трыумф палітычнага верхаглядства афіцыяльнай Польшчы, што на зварот да беларусаў адзываецца... аплочаны агент блізарукіх варшаўскіх палітыкаў «тэж бялорусін» п. Аляксюк і „іже с ним“, імёны якіх адзін Бог ведае... Ні адно вядомае беларускае імя, ні адна партыя, ні адна арганізацыя ў Сойм ня пойдуць, бо паважаюць самых сябе і шануюць інтарэсы Бацькаўшчыны. Ітак, у беларуска-літоўскай Віленшчыне палякі зьбіраюць свой польскі Сойм—без беларусаў, без ліцьвіноў, бяз жыдоў, бяз усіх іншых нацыянальнасьцяў. Такі Сойм ня толькі ня вырашыць Віленскага пытаньня, — бо хто-ж прызнае правамоцнасьць нясуразных аднабокіх рашэньняў такога Сойму?—а пашкодзіць тутэйшай польшчызьне і наагул Польшчы.

Такім неаўторытэтным быў-бы ў Вільні і ўсякі іншы Сойм, у склад якога ўвайшла-б толькі адна краёвая нацыянальнасьць: напр. літоўская, або беларуская, або яўрэйская і стала-б пісаць свае законы і далучаць..

Дзіўна, што палякі як быццам не разумеюць гэтакай простай ісьціны і ідуць адны... бутафорскім паходам.

Няхай ідуць!

М. К.

„Беларускія дзеячы“ з польскаю душою.

Некаторыя з асоб, называючых сябе „беларускімі дзеячамі“, а запраўды працуючых для адбудовы імпэрыялістычнай Польшчы, падазрыцельна лёгка забыліся, што цьвёрдых граніц у гэтай Польшчы на ўсходзе яшчэ няма.

Граніца, на якую згодзіліся ў Рызе бальшавікі, каб толькі „адчапіцца ад паноў у трудную часіну“ (як яны самі-ж пісалі ў сваіх газэтах), гэта яшчэ ня ёсьць цьвёрдая граніца Польскай Рэчы Паспалітай.

Па бальшавіцкай праграме не павінна быць наагул ніякіх граніц. А граніца між Савецкай фэдэрацыяй і буржуазнай Польшчай ёсьць для іх нешта часовае, каротка-вечнае, якое рухне і зьнішчыцца, калі пан Дзяржынскі пераедзе з Масквы ў Варшаву.

Ці споўніцца бальшавіцкае жаданьне ў даным прыпадку ці не — гэта справа іншая.

Але покуль ёсьць бальшавікі суседзямі, у Польшчы няма граніц у поўным „буржуазным“ значаньні гэтага слова.

Няма яшчэ цьвёрдай ўсходняй граніцы Польшчы і з пагляду сучаснага міжнароднага становішча.

Ліга Нацый Рыскага дагавору дагэтуль ня прызнала, і польскай ўсходняй граніцы па гэтаму дагавору для яе няма.

Ліга Нацый не сьпяшаецца з гэтым пытаньнем, усё чакаючы „законнага расейскага ўраду“, з якім Польшча павінна будзе дагаварыцца і аб „законных“, цьвёрдых граніцах між Расеяй і Польшчай.

А покуль што ўсходняя граніца Польшчы — рэч няпеўная і часовая.

Дапусьцім, аднак, што гэтая часовасьць зацягнецца, як гэта ўжо болей-меней і ёсьць. Ліга Нацый павінна будзе нешта зрабіць у справе усходніх граніц Польшчы, каб ухаваць гэтую рэспубліку ад усіх няпрыемнасьцей часовага становішча. Ліга Нацый павінна будзе прызнаць ці ня прызнаць граніцу па Рыскаму дагавору ці прызнаць яе з пеўнымі папраўкамі і гарантыямі для ня польскіх жыхароў Заходняе Беларусі і Украіны.

Заходняя Беларусь можаць тады утварыць асобную дзяржаўную частку, болей-меней незалежную і самастойную, толькі так ці гэтак зьвязаную з Польшчай, а можа быць яшчэ і з Літвою.

Не зракаючыся ідэала Незалежнай і Непадзельнай Беларусі, мы павінны рыхтавацца і быць заўсёды найлепей падгатаванамі да ўсякіх тактычных магчымасьцей.

Калі-б у палітыцы доўгі час нічога не зьмянілася, і Ліга Нацый занялась-бы пытаньнем аб правох нашага краю пад зьверхнасьцю Польшчы, — дык гэтыя правы аказаліcь бы большымі ці меншымі ў залежнасьці ад нас саміх.

Правы былі-б найбольшымі пры найбольшай сьвядомасьці, арганізаванасьці і наагул культурнасьці народа.

Дзеля гэтага нам, на ўсякі выпадак, які-б ён ня быў, трэба як можна болей працаваць у памянутым кірунку. Мы павінны мець як можна болей сьвядомых і арганізаваных сялян, сваіх газэт, школ, кніжак і да т. п.

Цяпер вернемся да асоб, з якіх пачалі гэты артыкул. Возьмем для прыкладу найбольш адкрытую постаць пана Аляксюка, які цяпер ужо перайшоў на „грунт польскай дзяржаўнасьці“.

Зусім нядаўна, калі гэта было карысна ня столькі, можа быць, для Беларусі, скольki для Польшчы, Аляксюк стаяў за „незалежную і непадзельную“ Беларусь.

Але вось, як толькі імпэрыялістам Польшчы „удалося“ ў Рызе падзяліць Беларусь, Аляксюк забываецца аб аддзеленай на захад частцы бацькаўшчыны і кідаецца з такім-жа, як сам, «беларусам» у душы, Булак-Балаховічам, „вызваляць“ усходняю частку. Не ўдаецца, і Аляксюк раптоўна аказываецца... на грунце польскай дзяржаўнасьці!

Падобны ўчынак, покуль доля Беларусі яшчэ ня вырашана, можна лічыць (на грунце беларускай дзяржаўнасьці) — здрадаю.

Мала таго, Аляксюк пераходзіць на польскасьць, не гаворачы ні аб якіх фэдэрацыях, аўтаноміях ці Заходняй Беларусі ў Польшчы, як зусім асобнай ад яе па складу жыхароў. „Да Польшчы!“ — і квіта.

Мала таго, Аляксюк мае дзерзасьць гаварыць ад імя Заходняй Беларусі, далучаючы яе да Польшчы ня толькі бяз усякіх гарантый, але навет бяз гутарак аб гарантыях.

Гэта ўжо ня здрада, а нешта горшае..

І зусім зразумела цяпер, чаму Аляксюк нічога ня робіць у культурным кірунку для падняцьця беларускіх шансаў ў справе адносін Заходняе Беларусі і Польшчы...

А. Мсьціслаўскі.

Выбары у польскі віленскі сойм.

Браты беларусы, працоўныя людзі! Да гэтуль у нас ніхто ня пытаўся, чаго мы хочам і што нам баліць. Рабілі з намі, што хацелі. Адна была ў нас уцеха, што мы сваей падпіскі на гвалт і зьдзек над намі нікому не давалі. Значыцца: рабі са мною, калі твая сіла, што хочаш, а маей згоды на гэта навет пад прымусам няма! Ды вось прышоў такі час, калі бяз нашай згоды панаваць камусь над намі ўжо ніякава.. Трэба яму, каб мы далі сваю падпіску. Прыдумалі склікаць у Вільні сойм. Намаўляюць нас выбіраць угодных Польшчы і паном людзей, каб яны далі за нас падпіску на вечную няволю. Дык-жа не; няўжо-ж мы гэткія цёмныя, што самі палезем у пастку на згубу? Выбраць сваіх верных людзей мы цяпер усё роўна ня зможам, дык няхай сойм склікаецца бяз нас і пастанаўляе штоxоцькі бяз нас! Вядома, ён пастановіць, што тут Польшча, дык трэба ў нас шмат зямлі пакінуць паном, а рэшту купяць у паноў дробныя панкі-мазуры ці будзе надзел іншым каланістам з Польшчы. Але хай пастанаўляе! Калі-ж на гэтую нягодную справу так патрэбна наша падпіска праз выбіраньне ў польскі віленскі сойм, дык падзівімся, што з яе будзе бяз нашай згоды! Мусіць, нічога ня будзе, і нашым панам, як ні круці, а прыдзецца падзяліцца зямелькай з намі, а ня так, як яны хочуць.

Дык ня слухайце-ж, браты беларусы, працоўныя людзі, нікога, а толькі свайго Нацыянальнага Камітэту, які загадаў, каб мы на гэтыя выбары, барані Бог, ня йшлі.

А як будзе склікацца ў Вільні Сойм пры іншых варунках, не для таго, каб далучыць нас да мазураў-каланізатараў, а для таго, чаго мы сямі хочам, — тады, можа, й пойдзем. А цяпер — ні пад якім відам, каб не запрадаць свой родны край і не астацца вечнымі безьзямельнымі батракамі.

Дзед Кузьма.

Карэспандэнцыі.

Начою з 6 на 7 лістапада ў в. Багуслававе Ражанкаўскай гміны, Лідзкага павету, селянін Васіль Дробыш, бацька траіх дзяцей, зарэзаў свайго войчыма Якуба Біндзея і родную матку Капярыну Дробыш. Матку кінуў у сенцах, а войчыма завёз за вёску ў крушню. Солтысу сказаў, што войчым зарэзаў матку і сам уцёк. Аднак, сьледзтва паказала, што войчым быў завезен пад крушню з перарэзаным горлам і бяз вопраткі. У бацькоў знайшлі па сьмерці каля 45.000 мар., што прыслаў меншы сын з Амэрыкі.

Мурашка.

22-га лістапада ў м. Орлі, Лідзкага павету, сабраліся солтысы і радныя, каб выбраць дэлегатаў да Ліды, а адтуль да Вільні на Сойм(?). Выстаўляюць кандыдатаў. Калі солтысы і радныя хацелі выбраць настаўніка-беларуса Янку Дразда, кантроль паліцыі Зюк забараніў выбіраць яго, сказаўшы: „On u mnie pod karabinem, pod nadzorem policji, ja nie pozwalam, ja nie znam go, nam nie potrzeba takich“, сказаў кантроль.

„Нам ня трэба такія“—пацьвярдзіў войт.

Увага. Вёска Сарокі—шчыра і сьвядома беларуская вёска, якая леташні год утрымлівала на свой кошт беларускую школу і настаўніцу. Янка Дрозд—беларус-настаўнік, школу якога ў леташнім годзе ў Прэціме гвалтоўна зачынілі, выгнаўшы вучняў на вуліцу.

І так, трэбыло выбіраць знаёмых і любых п. Зюку.

Мур.

З м. Крынак, Горадзенскай губэрні і павета паведамляюць:

Цяпер да нас з Польшчы прыяжджаюць мазурэ і купляюць у паноў зямлю.

Мазурам паны з вялікаю ахвотаю прадаюць, навет купчую робяць. Нашым-жа сялянам, хто сабраў якую марку, каб на яе павялічыць сваю гаспадарку,—не продаюць. Адмаўляюцца тым, што цяпер няможна зрабіць купчай. Часам, узяўшы навет задаткі, варочаюць іх назад, вымаўляючыся, што няможна прадаваць. Праз некатэры час людзі бачуць, што ў маёнтках, замест аднаго пана, зьяўляецца некалькі панкоў-мазуроў з Польшчы. Панэ, дзе ў катораго ёсьць лес, вырубаць, навет і тартакоў панастаўлялі, каб дзерава пілаваць на матар'ял. Бежанцы, вярнуўшыся і не заставшы сваіх будынкаў, зварачаваюцца да гэтых паноў, каб прадалі за грошы—панэ і слухаць ня хочуць. Увесь гэты матар'ял адвозяць на вакзалы, дзе грузяць у вагоны і вывозяць у Польшч. Прыкладам пан Дашкевіч з маёнтку Міляцічы, недалёка ад Вялікай Бераставіцы Горадзенскай губ. і павету. А каб людзі самі ня бралі, панастаўляў вартаў з вайсковых.

Янка Вехаць.

У с. Дзікунішкі Жалудзкай гміны, Лідзкага павету было два школьных будынкі: адзін драўляны, а другі цаментны. Драўляны збудован у 1900 годзе на кошт прыхаджанаў Дзікунішскае царквы. Да нямецкай акупацыі ён быў пад 2-клясовай школай, зьмяшчаў больш за 200 вучняў. Цяпер школьны інспэктар Лідзкага павету пан Вус распарадзіўся гэтай уласнасьцю Дзікунішскіх прыхаджан і загадаў перанесьці будынак за 10 вёрст у Вялікае сяло той-жа Жалудкай гміны. Сяляне пратэставалі, пасылалі сваіх прадстаўнікоў да пана Вуса, але рады не знайшлі... Будынак разламалі, папсавалі, часьць перавезьлі, а часьць яшчэ й цяпер гніе пад адкрытм небам. Сяляне плакалі, бо на будоўлю гэтай школы у свой час патрацілі астатнія грошы, вазілі лес за 18-20 вер. А прадстаўнікоў сялянскіх пан Вус яшчэ моцна вылаяў, назваўшы „зладзеямі і грабежцамі, паруйнаваўшымі ўсе школы“. А ўся справа, мабыць, у тым, што школа належала дя людзей, якія лічуць сябе беларусамі і хочуць беларускай школы. У такім прыпадку, відаць, можна без бальшавіцкага ладу адабраць чужую ўласнасьць!

Селянін.

У в. Аленкоўцах Лябедзкай гміны Лідзкага павету, дзе жывуць праваслаўныя беларусы адчынена супроць волі жыхароў польская школа. Вучыцельскай сюды была прыслана якраз тая асоба, з якой здарылася вядомая лідчанам гісторыя ў гатэлі ў Лідзе, запісаная паліцыяй у пратакол. Гэтая, здавалась-бы, зусім непабожная асоба, пачала асьвету з таго, што прымусіла ўсіх праваслаўных дзяцей вучыцца каталіцкія малітвы.

Вясковы.

Чаго-ж нам сядзець?

(Песьня на матыў: „Чаму-ж мне ня пець?“)

Чаго-ж нам сядзець,
Чаго-ж нам глядзець,
Як у нашу хатачку
Бяда ўсё плывець.

Чаго-ж нам сядзець,
Чаго-ж нам чакаць,
Запражом мы конікі
Ды пойдзем гараць!

Дабро нажываць—
Трэба працаваць,
А ня трэба ў хатачцы
Усё адпачываць.

Чаго-ж нам чакаць,
Чаго-ж нам глядзець,—
Пад ляжачы каменьчык
Вадзіца ня йдзець.

Калі будзем спаць
Ды будзем глядзець,
Дык ня будзем хлебачка
Мы ніколі мець.

Калі будзем жыць
І ўсё працаваць,—
Само шчасьце вольнае
Будзе нам сьпяваць.

1921 г. Д. Вясёлы.

Эканамічны аддзел.

У Сярэдняй Літве працуюць цяпер такія фабрыкі: Шкляныя гуты—4, цагельняў—5, варэльняў—5, смалярняў—10, фабр. серчыкаў.—2, клеярняў—2, мылярняў—17, гарбарняў—76, фабрык обуві—2, алеярняў—13, фабрык сахарыны—1, табачных—11, млыноў—130, тартакоў—15, паперняў—3, бравароў—25, фабрык гільз папяросных—8, чыкалядных—21, мінеральных водаў—26, фабрык касмэтычных вырабаў—3, півавярняў—3. („Jed.“)

У аддзелах Віленскага Саюзу Каапэратываў у Обсі, Паставах, Беняконях, Залесьсі, Маладзечні і Багданаве цэны на тавары значна паніжаны.

Гулка празываючыся „Цэнтральны Камітэт Краёвай Сувязі“ пана Аляксюка маець каапэратыў, які Аляксюк назваў „Самапомач“.

Каапэратыў маець свае аддзелы: у Залесьсі і Смаргонях і пякарню. Атрымлівае гэты дзіўны каапэратыў ад Дэпартаманта Апразізацыі па танным цэнам і пшонную муку, і сьвечкі, і соль і іншыя прадукты.

Ва ўсім краі істнавала толькі адна адчыненая ужо больш як паўтара года каапэратыўная аптэка ў Падбродзьдзі. Урад тлумачыць, што па закону каапэратывы ня маюць права адчыняць аптэку, дык замест таго, каб выдаць дадатковы закон, дадумаліся зачыніць яе. Кажуць, што ўраднік, які кіруе ўсімі справамі адчыненьня аптэк, ёсьць сам аптэкар, і гэта як быццам і зьяўляецца прычынай зачыненьня каапэратыўнай аптэкі.

„Kгупіса“

Бюро Прэсы пры Часовай Урадуючай Камісіі Сярэдняя Літвы прыслала нам для надрукаваньня гэткае

ВЫЯСЬНЕНЬНЕ.

З прычыны зьмяшчэньня ў №12 газэты „Беларускія Ведамасьці“ з дня 9-га сьнежня 1921 г. „Пісьма ў Рэдакцыю“ ў справе „Kгупісу“, Бюро Прэсы Ч. У. К. выясьняе вось што:

П. Знамяроўскі не чакаў з выпушчэньнем чарговага нумару „Kгупісу“ пяцёх дзён (як абавязуе 11 артыкул 80 дэкрэту), але выпусьціў яго ўжо цераз два дні ад часу паданьня заявы. Аддзел Прэсы Выдзялу Бесьпячэн Д. У. С. ніякіх вусных дазволаў п. Знамяроўскаму не даваў.

Апошні нумар „Kгупісу“ з подпісам п. Знамяроўскага быў зараз на выхадзе ў сьвет сканфіскаваны, а справа тая была скіравана ў Адміністрацыйна-Карны Выдзял Д. У. С. для пакараньня асобы, не па закону выпускаючай газэту, што і было Адм.-Карным Выдз. зроблена налажэньнем штрафу 10.000 марак.

Затое, што Дэпарт. Унутр. Спраў нікому канцэсіі пасьля зрачэньня яе п. Грыневічам не даваў, „Kгупіса“ перастала выхадзіць, а ня была зачынена, як тое цьвердзіць у тым „Пісьме ў Рэдакцыю“, аўтар.

Аб устроі Сэрбскай аутакефальнай царквы у Угоршчыне.*)

(Пачатак гл. у № 14 „Бел. Вед.“).

IV. Спаўняючым органам Сабора ёсьць Народна-Царкоўная Рада, якая складаецца, апроч патрыярха, з аднаго эпіскапа, дзьвюх духоўных асоб і пяцёх міран, выбраных Саборам зпаміж сябе. Да спраў Рады належаць: 1) укладаньне для Сабора праектаў новых правіл і гадовага буджэта, 2) абнародаваньне і спаўняньне пастаноў Сабора, 3) кантроль над спаўненьнем правіл царкоўнымі служачымі асобамі, 4) нагляд і кіраваньне царкоўнай маемасьцю, 5) спаўненьне буджэта і рэвізія справаздач усіх царкоўных установ, 6) разьвязаньне адміністратыўных спрэчак аб царкоўнай маемасьці.

V. Апэлятарская Кансысторыя разглядаець, як другая інстанцыя, справы царкоўныя, дысцы-

*) Друкуецца у зьвязку з пытаньнем аб аутакефаліі Беларускай Царквы.

ылівярныя і брачныя, якія пераносяцца з Эпархіяльных Кансысторый. Яна складаецца, апроч патрыярха, з двух япіскапаў, трох сяброў духоўных і трох з міран; усе яны выбіраюцца Саборам. Гэта адзіная ў праваслаўнай царкве царкоўна-судовая ўстанова, у каторую, побач з духоўнымі асобамі, уваходзяць прадстаўнікі ад міран.

VI. Усёю царкоўна-школьною справаю загадуе Вучэбная Рада, якая складаецца пад старшынствам патрыярха з Галоўнага Інспэктара, аднаго духоўнага і пяцёх сяброў-міран, выбраных Саборам.

На чале ўсяго царкоўнага кіраўніцтва ў эпархіі стаіць Эпархіяльны Сабор, ці Скупшчына. Ен складаецца, пад старшынствам архірэя, з інспэктара школ, усіх акруговых протапрасьвітэраў і дэпутатаў: а) ад духавенства па адным ад кожнага вокруга, б) ад школьных устаноў—па адным ад кожнае з сярэдніх і вышэйшых школ і па адным ад вучыцеляў і папячыцельстваў кожнага вокругу і в) дэпутатаў ад усіх паўнапраўных грамадзян, выбраных у гарадох простымі, а ў вёсках двухступеннымі выбарамі. Да спраў скупшчыны належыць загадываньне эпархіяльнай асабовага складу эпархіяльных устаноў.

Эпархіяльная Кансысторыя складаецца, пад старшынствам архірэя, з 2 пратаярэяў, з 2 сяброў духоўных і 2 міран, выбраных эпархіяльнай скупшчынай. Яна мае наглед над захаваньнем чыстасьці веравучэньня і правільнасцю богаслужэньня, назначае на пасады, зацьвярджае настаяцеляў манастыроў і разьвязвае судовыя справы, падлягаючыя царкоўнаму суду.

Эпархіяльная адміністратыўная рада (адбор) складаецца, пад старшынствам архірэя, з 2 сяброў духоўных і 4 міран, выбраных скупшчынай. Яна загадуе ўсёй адміністрацыяй эпархіі.

Школьная Рада эпархіі, складаецца, пад старшынствам архірэя, з інспэктара школ, 2 вучыцеляў, 2 духоўных сяброў і 10 міран. Яна загадуе ўсёю вучэбнаю справаю ў эпархіі.

Эпархія дзеліцца на протапрасьвітэрскія вокругі (благачыніі). У кожным вокругу істнуе Зьезд прадстаўнікоў ад грамад (абшчын). Ен выбірае протапрасьвітэра, выдае правілы для кіраваньня мясцовымі царкоўнымі ўстановамі і мае наглед над парахвіяльнымі школамі.

Усе асобы праваслаўнага веравызнаньня, жывучыя на тэрыторыі парахвіі, складаюць царкоўную грамаду. У кожным прыходзе ўсе мужчыны, дасягнуўшыя 24 гадоў, выбіраюць на 6 гадоў прадстаўнікоў ў Парахвіяльную Скупшчыну.—Скупшчына клапоціцца аб добрым стане царквы, маючы будынкаў парахвіяльных устаноў, выбірае кандыдата на парахвіяльнага сьвяшчэньніка. Упаўнажненым спаўняючым органам Скупшчыны ёсьць выбраны ёю Адбор, пад старшынствам парахвіяльнага сьвяшчэньніка.

Гэткі запраўды дэмакратычны ўстрой Сербскай Карлавіцкай царквы. Вядомы расейскі кананіст нябожчык а. Міхаіл Гарчакоў, кажа, што гэты ўстрой найбольш адпавядае традыцыям праваслаўнае царквы, дапамагае рэлігійнаму прабуджэньню і нацыянальнаму сьвядомасьці міран і развівае ў кожным патрэбу ў сьвядомым і дзеяльным супрацоўніцтве ў грамадзкіх справах.

Т. Вароніч.

Палітычная хроніка.

Грэка-турэцкая вайна.

З Канстантынопаля паведамляюць, што дзяржавы Антанты выслалі сваіх прадстаўнікоў для пасярэдніцтва ў перагаворах між Грэцыяй і Турэччынаю. У дыплёматычных кругах Антанты пануе перакананьне, што грэка-турэцкая вайна неўзабаве закончыцца; яшчэ каля Раждства будзе склікана міравая канфэрэнцыя ў Парыжы.

Зьмена міністраў у Юга-Славіі.

„Новое Время“ паведамляе з Белграду:

Старшыня рады міністраў Мікола Пашыч 8-га сьнежня аддаў назад каралю даручэньне стварыць агульна-партыйны склад міністраў, бо перагаворы яго з правадырамі партыяў скончылісь ніякава.

Кароль даручыў цяпер запрашаць новых міністраў правадыру дэмакратаў п. Давідовічу.

Выбары ў Баўгарыі.

„Руспрэс“ паведамляе з Софіі, што на сельскіх выбарах, якія цяпер адбываюцца скрозь у Баўгарыі, камуністы дасталі большасьць галасоў у 3-4 сёлах. У камуністычных цэнтрах Баўгарыі, якімі ёсьць Варна і Бургас, пры новых выбарах камуністы дасталі менш галасоў, чымся буржуазныя партыі.

Энвэр-паша ў паразуменьні з бальшікамі.

Вядомы турэцкі дзеяч Энвер-паша забраў Батум і абвёсьціў там мабілізацыю. Ен выступае ў паразуменьні з бальшавікамі супроць ангорскага турэцкага ўраду, зрабіўшага ўмову з Францыяй. Ангорскі ўрад прыслаў Энвэр-пашы ультыматум, даючы яму некалькі дзён на выхад з Батуму.

ПалкоўнікШардіны у Віл. Бел. Нацыянальным Камітэце.

У суботу, 17 сьнежня, каля адзінаццатай гадзіны дня адведаў Беларускі Камітэт Старшыня Кантрольнай Камісіі Лігі Нарадаў палкоўнік Шардіны. Разам з прысутным у Камітэце сябром К-ту гр. Карабачом палкоўнік Шардіны направіўся з Камітэту у кватэру дырэктара гімназіі М. Кахановіча, дзе ў працягу больш як гадзіны знаёміўся з поглядамі Віленскага Беларускага Нацыянальнага Камітэту па розным культурным і палітычным справам сучаснага мамэнту. Тэмай размоў былі: адносіны беларусаў да Віленскага Сойму, да Тымчасовай Урадуючай Камісіі Сярэдняй Літвы, справа беларускай школы у Сяр. Ліцьве і ў Польшчы, справа аб варочаючыхся ў Заходнюю Беларусь бежанцах і мн. інш.

Уважна выслухаўшы інформацыі прадстаўнікоў К-ту, п. Шардіны пасьля 12 гадз. дня разьвітаўся з прысутнымі сябрамі К-ту.

Пры размове былі прысутнымі: гр. А. Смоліч, гр. А. Карабач і гр. М. Кахановіч.

ХРОНІКА.

✦ Беларусы! Каму дарагі справы роднае культуры, усе, як адзін, запісывайцеся ў Таварыства Беларускае Школы. Запісывацца можна ў Віленскай Беларускай Кнігарні (Завальная, 7), а з правінцыі—прыслаўшы пісьменую заяву у Таварыства (Вільня, Вострабрамская, 9). Выпісывайце Статут Таварыства. Чым болей будзе сяброў у Таварыстве, тым лягчэй будзе разьвіваць беларускую асьвету. Запісацца можаць і павінен кожны: інтэлігент, селянін, работнік.

✦ ГРАМАДЗЯНЕ!

Педагогічная Рада 1-ае Віленскае Беларускае Гімназіі пачала арганізаваць папулярную і навуковую бібліатэку для сваіх вучняў. Да апошняга часу справа гэта стаяла так: кніг было мала, а падручнікаў і навуковых кніг было яшчэ менш. Цяпер Педагогічная Рада хоча папоўніць гімназіяльную бібліатэку кнігамі і падручнікамі па ўсім краінам знацьця, каб даць дзяцём вельмі незаможных, бедных бацькоў магчымасьць карыстацца патрэбнымі навуковымі падмогамі.

Грамадзяне, ахвяруйце грошы, прыносьце і прысылайце кнігі. Кожная новая кніга зьменшыць сучасную, нячуваную дагэтуль патрэбу ў навуковых падмогах, пашырыць беларускую асьвету.

Ахвяры грашмі і кніжкамі на усіх мовах прыймаюцца што дзень у час лекцый (9-2 г. г.) ў будынку гімназіі—Вострабрамская 9, загадчыкам бібліатэкі, вучыцелем М. Красінскім.

М. К.

✦ Польскі ўрад усілівае рэгламэнтацыю аб высяленьні ўцекачоў, якія знаходзяцца ў мясцовасьцях уздоўж беларускае граніцы. Двесяткам тысяч уцекачоў пагражае высяленьне („Е. Т.“).

✦ У Менскім Беларускім унівэрсытэце устаноўлена катэдра яўрэйскай літэратуры.

✦ „Вил. Утро“ паведамляе: На паседжаньні прэзыдыума Цэнтральнага Бюро клясавых прафэсыянальных хаўрусаў у Вільні было пытаньне, нашто аддалі салю Работніцкага Дому Аляксюкоўскаму зьезду? Казалі, што работніцкія арганізацыі ня могуць аддаваць памяшчэньне Работніцкага Дому для падобных зборышчаў.

З адказаў сэкрэтарыята культурна-прасьветнай сэкцыі, пад загадам якой знаходзіцца саля, высьвілася, што работнікі, здаючы салю, думалі, што яна здаецца для зьезду беларусаў, а не для Аляксюка.

✦ „Jednaść“ паведамляе: Паўстанцы на Беларусі ў сучасны мамэнт згрупаваліся між мяст. Пагостам і Слуцкам. Найбольшае паўстанчае гнязд, каля 2000 узброеных кулямётамі душ, знаходзіцца ў лясох. Паўстанцы маюць добрае камандаваньне і арганізацыю і робяць частыя налёты на бальшавіцкія гарнізоны. Апошні налёт быў зроблены на мястэчка Уздзу, Ігуменскага павету, дзе паўстанцы выразалі бальшавіцкі гарнізон і камісараў.

✦ Дзеля адмовы п. Генадзія Богдановіча,—выкладаць беларускую мову і гісторыю беларускае літэратуры ў жаноцкай гімназіі Пасьпелавай будзе сьвяшчэньнік а. Міхаіл Кушнёў.

✦ За астатні час раптоўна адчынілася ў Вільні некалькі пачаткавых расейскіх школ. Былі выпадкі, што школкі гэтыя, дзякуючы агітацыі, адцягнулі былі дзяцей з беларускіх пачатковых школ.

✦ Інспэктарам Віленскай Літоўскай Праваслаўнай Сэмінарыі, дзеля адмовы В. К. Нядзельскага ад займанай пасады, выбран ігумен а. Пілін.

Беларускую мову ў Сэмінарыі выкладае п. Генадзій Богдановіч, а беларускую літэратуру п. М. Косьцевіч (часова, замест хворага М. Гарэцкага).

✦ Заняткі перад Калядамі канчаюцца ў 1-й Віленскай Беларускай Гімназіі 23 сьнежня (10 дзекабра).

✦ Пан Аляксюк паслаў Старшыні Час. Урад. Камісіі Сярэдняе Літвы пану Мэйштовічу такую тэлеграму:

„Прадстаўнікі беларускага сялянства, народных арганізацыяў і партый, сабраныя на зьездзе Заходняй Беларусі, пасылаюць Вам, як прадстаўніку ўлады Сярэдняе Літвы, сваё паздараўленьне і пажаданьне, каб Віленскі Сойм, як выказуючы волю жыхароў нашага края, падцьвердзіў нашае рашэньне аб далучэньні гэтага края да Польскай Рэспублікі. Старшыня зьезда Аляксюк“.

✦ На тэлеграму пана Аляксюка Старшыня Час. Урад. Камісіі Сярэдняе Літвы пан Мэйштовіч адказаў так:

„З вялікай радасьцю прыняў высланае таксама і мне паздараўленьне зьезда прадстаўнікоў народных арганізацыяў беларускага сялянства, а таксама выказаныя Вамі пажаданьні.

Хацеў-бы, каб пастанова беларускіх сялян выступіць у часе выбараў зрабіла ўплыў сваім прыкладам на ўсіх жыхароў, каб і яны прынялі-б вучасьце ў выбарнай кампаніі, каторая павінна рашыць долю нашага края“.

✦ Генарал Канаржэўскі выдаў загад, забараняючы польскім вайсковым гаварыць парарэйску („G. L.“).

Беларускі Музыкальна-Драматычны Гурток.

Даводзіць да ведама ўсіх беларусаў, што жадаючыя абходзіць сьвяткаваньне сёлетней Куцьці могуць запісывацца ў Гуртку, уносячы складку 1000 м. Вячэра пачнецца а 7 гад.

У сьвяточныя дні Гурток ладзіць:

25 сьнежня—лото, 26 сьнежня—танцавальны вечар, 27 сьнежня—лото, 28 сьнежня—прадстаўлена будзе: „Каралевіч Зыля“, „Я памёр“ і „Парэвізы“. 29 сьнежня—„На папасе“, „Модны Шляхцюк“ і дывэртысмэнт. 30 сьнежня—Баль-маскарад. 31 сьнежня—Спатканьне Новага Году. Прадстаўлены будзе: „На папасе“, „Багаты і бедны“, „Новы Год“, Хор безработных, каза, дывэртысмэнт і іншае. 1 студня 1922 г.—лото, 2 студня—прадстаўлена будзе: „Марцэлька“ для вучняў Віленскіх беларускіх школ. 3 студня—лото, 4 студня—прадстаўлена будзе: „Лес шуміць“ і „Боты“. 6 студня—Баль-маскарад.

Новыя дэкарацыі.

Выступаюць усе мастацкія сілы і папоўнены аркестар.

Падзяка.

Бел. Кам. Помачы за вечарынку 11-га сьнежня на карысьць беларускага прытулку сабраў чыстага даходу 72.000 м. За чыннае і ахвярнае ўчасьце ў арганізаваньні вечарынкі Камітэт шчыра дзякуе: М. Красінскаму, У. Знамяроўскаму, С. Рак-Міхалоўскаму, Ф. Згірскаму, загадчыцам прытулку: С. Кішко і М. Шутавічанцы, гімназістам, сэмінарыстам і інш.

Кс. А. Станкевіч.
Старшыня Камітэту.

17. XII. 21.
Вільня.

Адказы чытачом.

К. Шашко — Докшыцы.

З просьбай аб пэнсію трэба зьвяртацца да Падатнога Інспэктара (Inspektor Skarbowy). На яго імя падаецца прашэньне, да каторага далучаюцца:

1) Пэнсіянерская кніжка.
2) Пасьведчаньне гміны або паліцыі, што пэнсіянер жывы і ня згубіў права на пэнсію.
3) Пасьведчаньне Старосты Павятовага, што а) пэнсіянер ня маець з чаго жыць і б) што ён ніколі не ваяваў процію палякоў.
4) Пасьведчаньне гміны аб тым, гдзе радзіўся, або мэтрыку.

(Разпараджэньне Генаральнага Камісара Усходніх зямель ад 11 II 20. Nr. 268).

Курс на грошы ў Вільні.

18 сьнежня 1921 г.

Царскія 500 р.	1100
„ 100 р.	600
Дробныя па 25 р.	180
„ па 10 р.	120
Думскія (1000 р.)	250
„ (250 р.)	150
Нямецкія маркі	17
Осты	16
Фунты	13100
Даляры	3100
10 руб. золатам	14850

РАДЗІМ КУПЛЯЦЬ:

Антон Навіна — *„Пуцяводныя ідэі беларускае літэратуры“* адбітка з „Нашае Думкі“, цана 25 польск. мар.

А. Канчар — *„Клясавае, нацыянальнае і рэлігійнае змаганьне на Беларусі“.* адбітка з „Нашае Думкі“ цана 25 польск. м.

Выпісаць можна з Беларускай Кнігарні (Wilno, Zawalna, 7).

M. Harecki.—*Krótki zarys historji literatury białoruskiej.* 1921 г. 28 str. Wyd. „Nowin Wileńskich“. Do nabycia w księgarniach Wileńskich.

Д-р Антон Краскоўскі (агульная медыцына)
Вострабрамская 20—6. Прыймовыя гадзіны: 8—9; 2—3; 7—8

Вышли изъ печати и поступили въ продажу:

1) Виленскій Православный КАЛЕНДАРЬ на 1922 г.

съ РИСУНКАМИ 64 стр., размѣръ 1/8 печ. листа. СОДЕРЖАНІЕ: Лѣтосчисленіе (статья). Пасхалія. Праздники, посты, сплошныя седмицы. Православныя святцы. Списокъ православныхъ святыхъ. КАЛЕНДАРИ: римско-католическій, протестантскій и еврейскій. Православная церковь (очеркъ). Мѣстное законодательство. Бѣлоруссы (историч.-статистич. справка). Справоч. свѣдѣнія. ЦѢНА 200 марокъ, при покупкѣ большого количества — скидка по соглашенію.

2) Православный ТАБЕЛЬ-КАЛЕНДАРЬ. Составленъ по новому и старому стил. разм. 51×28 с.

— ПРОДАЮТСЯ ВО ВСѢХЪ КНИЖНЫХЪ МАГАЗИНАХЪ. —
СКЛАДЪ ИЗДАНІЯ въ Виленскомъ Епархіальномъ складѣ (Островоротная улица № 7.)

Пачатковыя школы, бібліатэкі, чытальні могуць палучаць „Беларускія Ведамасьці“ ДАРМА, выслаўшы тольні грошы на перасылку газэты (30 марак на 3 месяцы).

Усіх паважаных грамадзян войтаў і солтысаў, якім пасылаюцца „Бел. Вед.“, просім прысылаць нам адрасы сялян, якія таксама хочуць палучаць газэту.

Сябры і грамадзяне! Складайце грошы на газэту, якая бароніць нашу народную справу. Зьбірайцеся гурткамі і выпісывайце на вёску хоць адзін экзэмпляр. Калі будзе больш падпісчыкаў, газэта станець на цьвёрдыя ногі. Не адкладайце падпісывацца, бо ад гэтага залежыць далейшае жыцьцё «Беларускіх Ведамасьцей». Хто ня ўмее чытаць, хай просіць, каб яму прачытаў пісьменны сусед, або настаўнік, або сьвяшчэньнік, або старэйшы вучань беларускай школы. Зьбірайцеся грудам і чытайце разам. Вучыцеся бараніць нашы народныя справы. Памажыце газэце, якая з вамі і за вас адбіваецца ад нашых нацыянальных і сацыяльных ворагаў і працуець над разьвіцьцем роднае культуры. Лічыце сваім абавязкам скласьці хоць адну марку на агульную народную справу. Браты, прыміце блізка да сэрца ўсе гэтыя словы! Настаўнікі, пільнуйце, каб «Беларускія Ведамасьці» ў вашым раёне выпісываліс і пашыраліс.

Хай жывець народная справа!

Адрэс: Wilno, Ostrobramska № 9, „Беларускія Ведамасьці“.

Канст. Паўл. Воўк-Карачэўскі шукаець зігінуўшага невядома дзе

Міхаіла Паўлавіча Воўк-Карачэўскага

і надта просіць усіх, хто што знаець аб ім напісаць: Россия П. О. Рай Бохотской вол., Мстиславльского уезда, Смоленской губ., околіца ХВЕНЫ.

Изданія Русскаго Телеграфнаго Агенства и Прессбюро „РУССПРЕСС“

Вышли въ свѣтъ и поступили въ продажу:

1) Православный календарь (для Польши) на 1922 год. Цѣна 200 мар.; для странъ съ высок. валют. 2 фр. Содержитъ: полный мѣсяцесловъ, подробныя справочныя свѣдѣнія о Православной Церкви и русскихъ учрежденіяхъ въ Польшѣ, адреса высшихъ польскихъ госуд. учрежденій, свѣдѣнія объ администр. дѣленіи Польши и отдѣлъ V Польской Конституціи о правахъ и обязанностяхъ гражданъ.

2) Русскій Эмигрантскій Календарь на 1922 г. Цѣна 200 п. мар.; для странъ съ высок. валют. 2 фр.

3) Табель-Календарь на 1922 г. Цѣна 45 п. мар.; для странъ съ высокой валютой 50 сант. Краткій мѣсяцесловъ съ обозначеніемъ праздниковъ красной краской.

4) Карманный Календарь на 1922 г. Цѣна 40 п. мар.; для странъ съ высок. валют. 45 сант.

Главный складъ и экспедиція: Издательскій Отдѣлъ Агентства „РУССПРЕССЪ“, Варшава, Żórawia 26, тел. 193-35.

Почтовый адресъ: Warszawa, skrynka pocztowa 192, „Russpress“.

Для денежныхъ пересылокъ: Warszawa, filja 14 „Russpress“.

Книгоиздательство „АРГОНАВТЫ“ Берлинъ

Печатается и скоро выйдетъ въ свѣтъ СПРАВОЧНИКЪ-АЛЬМАНАХЪ на 1922 годъ.

Изящно изданный СПРАВОЧНИКЪ-АЛЬМАНАХЪ содержитъ самыя полныя свѣдѣнія о русскихъ учрежденіяхъ за границей, юридическія свѣдѣнія (правила въѣзда и выѣзда, право репатріаціи и оптаціи), условія поступленія въ высшія учебныя заведенія и пр. и пр. на основаніи новѣйшихъ данныхъ. Важнѣйшія свѣдѣнія о новообразовавшихся государствахъ Европы.

Новѣйшія данныя по вопросу о возстановленіи экономическихъ сношеній между странами восточной и центральной Европы.

Богатый литературно-научно-художественный матеріалъ съ портретами, иллюстраціями и картами.

Особый отдѣлъ о Совѣтской Россіи: новые декреты о свободной торговлѣ, экономической политикѣ, правила о въѣздѣ, тарифныя правила, почтовыя и др. и рядъ адресовъ и свѣдѣній, имѣющихъ важное информаціонное значеніе для русскихъ внѣ Россіи.

Около 250 страницъ текста большого формата.

Съ заказами обращаться въ издательство:

„ARGONAUTEN“ Buch - und Kunstverlag G. m. b. H. Berlin W. 15. Bayerischestr. 32. Telephon: Uhland 1887.

БЕЛАРУСКАЕ ПРЭС-БЮРО у Рэвалі можаць памагчы знайсьці радню і знаёмых ўва ўсіх краёх.

Estonija, Rewal, Post-kast 153. Biełaruskaje Press-Biuro.

ВЫЙШАЎ Беларускі Календар на 1922 год

Пытайцеся ў кнігарнях.

„Беларускі Звон“ тыднёвая часопісь

Адрэс: Вільня, Біскупская вул. 12.

Падпіска на 3 месяцы каштуе 400 польск. м.

Зборнік „Беларускіх Ведамасьцей“ № 2.

Зьмест: Знамяніты сучасны беларускі паэт Я. Купала (з партрэтам); Залаты век беларускага слова (з прыкладам подпісаў беларускіх вяльмож); У лесе — верш Н. Арсеньевай; Жалобны звон — верш П. Мальвы; Гутарка аб кладзе — апавяданьне М. Гарэцкага; Усячына (лічбы сусьветнай вайны) — А. С.; У чыецы—верш Ф. Багушэвіча; У чайцы на вадзе жыцьця — Г. Леўчыка (пер. з К. Тэтмаера).

Цана: 22 польскіх маркі з перасылкай; для падпісчыкаў „Белар. Ведам.“ — 15 польск. марак.

Рэдактар і Выдавец: Максім Гарэцкі.

Друкарня „ДРУК“, Субач 2.